(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
"ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ
І ФАЛЬКЛОРУ ІМЯ К. КРАПІВЫ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ"

УДК 398.61(=81)

АЛФЁРАВА
Алена Генадзьеўна

ВОБРАЗНА-ПАЭТЫЧНАЯ СІСТЭМА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ І ЗАХОДНЕСЛАВЯНСКІХ ЗАГАДАК АБ ПРЫРОДНЫХ З'ЯВАХ І РАСЛІННЫМ СВЕЦЕ (ПАРАЎНАЛЬНЫ АСПЕКТ)

10.01.09 – фальклярыстыка

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

Мінск, 2007

Работа выканана ў аддзеле славістыкі Дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі"

Навуковы кіраўнік: доктар філалагічных навук, прафесар Кабашнікаў Канстанцін Паўлавіч

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай культуры і фальклярыстыкі УА "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны" Новак Валянціна Станіславаўна

кандыдат філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік аддзела фальклярыстыкі ДНУ "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі" Гурскі Антон Іванавіч

Апаніруючая арганізацыя: Беларускі дзяржаўны універсітэт

Абарона адбудзецца 25 кастрычніка ў 11 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.01 пры Дзяржаўнай навуковай установе "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, п. 302; тэл. 284-18-81).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ДНУ "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі"

Аўтарэферат разасланы 21 верасня 2007 года.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
доктар гістарычных навук Г.І. Каспяровіч

АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

Актуальнасць тэмы дысертацыі. Тэма дысертацыі звязана з недастаткова распрацаванымі пытаннямі параўнальнага вывучэння вобразна-паэтычнай сістэмы славянскіх загадак пра прыродныя з'явы і раслінны свет. Зварот да названых тэматычных груп славянскіх загадак прадыктаваны тым, што на аснове аналізу іх вобразаў і паэтыкі можна прасачыць рух жанру на першапачатковай стадыі яго развіцця. Сістэмнае вывучэнне тыпалогіі, дынамікі і нацыянальнай адметнасці метафарычных замяшчальнікаў на прыкладзе загадак некалькіх славянскіх народаў з'яўляецца на сённяшні дзень адным з ключавых і прыярытэтных у параўнальнай фальклярыстыцы, мае важнае значэнне ў вырашэнні агульнатэарэтычных і культурна-гістарычных (генетычных) праблем, што і вызначае навуковую актуальнасць дысертацыі. Пытанні тыпалогіі і нацыянальнай адметнасці вобразна-паэтычнай сістэмы славянскіх загадак у разрэзе асобных тэматычных груп застаюцца аднымі з самых нераспрацаваных, што падкрэслівае актуальнасць і навуковую навізну абранага даследчага кірунку.

Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі. Дысертацыйная праца, тэма якой зацверджана на Вучоным савеце Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі (пратакол № 1 ад 29 студзеня 2004 г.), адпавядае прыярытэтнаму кірунку фундаментальных навуковых даследаванняў "10.3 Гісторыя культуры Беларусі, актуальныя праблемы яе сучаснага стану і перспектывы развіцця: раскрыццё рэгіянальнай і лакальнай разнастайнасці нацыянальнага фальклору, яго унікальнасці ў сферы духоўнай спадчыны народаў Еўропы". Дысертацыя з'яўляецца састаўной часткай навукова-даследчых тэм: "Беларускі фальклор у агульнаславянскім кантэксце" (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20012251), якая распрацоўвалася Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі ў 2001 – 2005 гг.; "Традыцыі беларускай народнай творчасці ў глабалізаваным славянскім свеце: аксіялогія, сацыядынаміка, жанрава-відавая разнастайнасць фальклору" (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20061101), якая распрацоўваецца ў аддзеле славістыкі ў межах Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2006 – 2010 гг. "Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры" ("Гісторыя і культура").

Мэта і задачы даследавання. Мэта дысертацыі: шляхам параўнання вобразна-паэтычных сістэм усходнеславянскіх і заходнеславянскіх загадак пра прыродныя з'явы і раслінны свет вызначыць падабенства і адрозненне ў спосабах рэпрэзентацыі загаданых аб'ектаў. Для дасягнення азначанай мэты ставяцца наступныя задачы:

– вызначыць культурна-гістарычную дынаміку фаз метафарызацыі прыродных і раслінных аб'ектаў, іх колькасныя і якасныя характарыстыкі ў розных славянскіх традыцыях;

– даказаць, што агульныя метафарычныя вобразы ў сваіх вытоках абумоўлены асаблівасцямі міфалагічнага ўспрымання свету, а таксама агульнасцю чалавечага мыслення;

– выявіць прычыны адрознення ў тыпах метафарызацыі прыродных і раслінных аб'ектаў;

– паказаць, што паэтыка загадак абумоўлена выбарам аб'екта загадвання і тыпам метафарычнага замяшчальніка;

– ахарактарызаваць асаблівасці вобразна-паэтычных сістэм у кожнай з тэматычных груп.

Аб'ект даследавання – сукупнасць беларускіх, рускіх, украінскіх, польскіх, славацкіх і чэшскіх загадак пра прыродныя з'явы і раслінны свет.

Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:

1. Упершыню ў беларускай фальклярыстыцы сістэматызаваны вобразы і паэтыка беларускіх, рускіх, украінскіх, польскіх, славацкіх і чэшскіх загадак аб прыродных з'явах і раслінным свеце. Вобразна-паэтычная сістэма славянскіх загадак названых тэматычных груп групуецца на агульных, але рознастадыяльных тыпах метафарызацыі аб'ектаў загадвання. Пераход ад старажытных да новых тыпаў метафарызацыі абумоўлены зрухам у культурна-грамадскім жыцці і светапоглядзе.

2. Наяўнасць і семантыка агульных зааморфных і большасці антрапаморфных рэферэнтаў прыродных з'яў і аб'ектаў выяўляе міфалагічную аснову славянскіх загадак, структуры якіх узніклі ў той час, калі культурная свядомасць магла аперыраваць толькі тоеснасцю суб'екта і аб'екта.

3. Нацыянальны каларыт паэтыкі славянскіх загадак, змястоўнасць іх паэтычных вобразаў, мастацкіх сродкаў і прыёмаў залежыць ад асаблівасцей навакольнага (прыроднага, бытавога, культурнага) этнічнага асяроддзя, якія адметным чынам кампануюцца пры стварэнні тэксту загадкі.

4. Выкарыстанне паэтычных сродкаў, асаблівых характарыстык метафары, эпітэта, анаграмы непасрэдна звязана з вызначальнымі рысамі аб'екта мастацкага ўвасаблення, а таксама з выбраным для яго замяшчэння тыпам метафарычнага рэферэнта.

5. Прадуктыўнасць тэматычнай групы загадак пра раслінны свет, абумоўленая вялікай колькасцю магчымых аб'ектаў загадвання, прывяла да з'яўлення новых нюансаў у паэтычным змесце метафары, у якой побач з атаясамліваннем з'яўляюцца прыкметы свядомага параўнання (станоўчага і адмоўнага) на аснове знешняга падабенства з загаданым аб'ектам па форме,

колеры, дзеянні, функцыі, шырокага выкарыстання апісанняў, вельмі рэдкіх у загадках пра прыродныя з'явы, і нацыянальна адметнага ўжывання паэтычнай тропікі.

Асабісты ўклад суіскальніка вучонай ступені. Дысертацыя з'яўляецца самастойным даследаваннем аўтара. У дысертацыі ўпершыню ў беларускай фальклярыстыцы супастаўлены вобразна-паэтычныя сістэмы ўсходнеславянскіх і заходнеславянскіх загадак пра прыродныя з'явы і раслінны свет, вылучаны асноўныя тыпы метафарычных замяшчальнікаў, акрэслена кола аб'ектаў загадвання, прааналізаваны тыпалагічная і нацыянальна адметная групы метафарычных рэферэнтаў аб'ектаў загадвання.

Апрабацыя вынікаў дысертацыі. Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэннях аддзела славістыкі ІМЭФ імя К. Крапівы НАН Беларусі. Асноўныя тэарэтычныя палажэнні дысертацыі і вынікі даследавання выкладзены на міжнародных навуковых канферэнцыях "Язык и социум" (Мінск, 3 – 4 снежня 2004 г.), "Фальклор і сучасная культура" (Мінск, 27 – 28 красавіка 2006 г.), "Мова – Літаратура – Культура" (Мінск, 16 – 17 лістапада 2006 г.); штогадовых Шырмаўскіх чытаннях (Мінск, 18 лістапада 2003 г.; 30 лістапада 2004 г.; 19 лістапада 2005 г.).

Апублікаванасць вынікаў. Вынікі даследавання апублікаваныя ў пяці навуковых артыкулах у часопісах, рэкамендаваных ВАК, аб'ёмам 1,6 аўтарскага аркуша, шасці артыкулах у навуковых зборніках і зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый аб'ёмам 1,7 аўтарскага аркуша.

Структура і аб'ём дысертацыі. Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, аналітычнага агляду літаратуры па тэме, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса, сямі дадаткаў. Аб'ём дысертацыі – 134 с., з іх 15 старонак займае бібліяграфічны спіс (усяго 173 найменні: 162 найменні – "Спіс выкарыстаных крыніц", 11 найменняў – "Спіс публікацый суіскальніка"), 16 старонак – сем дадаткаў.

ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва "**Уводзінах**" аналізуецца ступень вывучанасці праблемы, актуальнасць тэмы, вызначаны шляхі далейшага даследавання.

Першая глава "Тэарэтычныя праблемы даследавання жанру загадкі" складаецца з трох раздзелаў. У раздзеле 1.1 "Аналітычны агляд літаратуры па тэме дысертацыі" праводзіцца аналіз даследаванняў, прысвечаных вывучэнню жанру загадкі, параўнанню вобразна-паэтычных сістэм славянскіх загадак (Н.С. Гілевіч, А.І. Гурскі, К.П. Кабашнікаў, В.В. Мітрафанава, Й. Касьян, Л. Саднік). Адзначаецца недастатковая колькасць даследаванняў, скіраваных на параўнальна-супастаўляльны аналіз вобразна-паэтычных сістэм усходнеславянскіх і заходнеславянскіх загадак аб прыродных з'явах і раслінным свеце. У раздзеле 1.2 "Структура загадкі"

СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

Артыкулы ў часопісах, рэкамендаваных ВАК

1 Алфёрава, А.Г. Зааморфныя вобразы як рэпрэзентанты прыродных з'яў у славянскіх загадках / А.Г. Алфёрава // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітарных навук. – 2006. – № 4. – С. 79 – 84.

2 Алфёрава, А.Г. Антрапаморфныя метафарычныя вобразы ў славянскіх загадках пра прыродныя з'явы / А.Г. Алфёрава // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 1. Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2006. – № 4. – С. 80 – 83.

3 Алфёрава, А.Г. "Ідзе без ног, б'е без рук": Урок па тэме "Загадкі". V клас / А.Г. Алфёрава // Роднае слова. – 2006. – № 8. – С. 77 – 78.

4 Алфёрава, А.Г. Побытавыя рэаліі і колеры ў славянскіх загадках пра прыродныя з'явы / А.Г. Алфёрава // Роднае слова. – 2007. – № 4. – С. 89 – 91.

5 Алфёрава, А.Г. Роля загадак у педагагічна-выхаваўчым працэсе. Асаблівасці нацыянальнай традыцыі на прыкладзе славянскіх загадак пра раслінны свет / А.Г. Алфёрава // Народная асвета. – 2007. – № 4. – С. 93 – 96.

Артыкулы ў навуковых зборніках і зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый

6 Алфёрава, А.Г. Агульнае і нацыянальна адметнае ў метафарыстыцы ўсходнеславянскіх загадак пра раслінны свет / А.Г. Алфёрава // Фальклярыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. арт. / пад нав. рэд. Р.М. Кавалёвай, В.В. Прыемка. – Мінск, 2004. – Вып. 1 – С. 100 – 105.

7 Алфёрава, А.Г. Моўная актуалізацыя антрапаморфнага ў метафарыстыцы славянскіх загадак / А.Г. Алфёрава // Язык и социум: материалы VI Междунар. науч. конф., Минск, 3 – 4 декабря 2004 г.: в 2 ч./ редкол.: Л.Н. Чумак [и др.] – Минск, 2004. – Ч. 1. – С. 256 – 259.

8 Алфёрава, А.Г. Метафарыстыка загадак / А.Г. Алфёрава // Беларускае літаратуразнаўства: навук.-метад. альманах / рэдкал. Л.Д. Сінькова [і інш.]. – Мінск, 2005. – Вып. 1. – С. 12 – 21.

9 Алфёрава, А.Г. Да пытання аб канцэптуальнай сферы славянскіх загадак / А.Г. Алфёрава // Фальклярыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. арт. / пад нав. рэд. Р.М. Кавалёвай, В.В. Прыемка. – Мінск, 2005. – Вып. 2. – С. 149 – 152.

10 Алфёрава, А.Г. Спецыфіка метафары ў славянскіх загадках пра прыродныя з'явы і раслінны свет / А.Г. Алфёрава // Фальклор і сучасная культура: матэрыялы І Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 27 – 28 крас. 2006 г. / Беларус. дзярж ун-т; рэдкал.: Роўда І.С. [і інш.]. – Мінск, 2006. – С. 73 – 77.

11 Алфёрава, А.Г. Стадыяльнасць форм метафарычнага выяўлення аб'ектаў у славянскіх загадках пра прыродныя з'явы / А.Г. Алфёрава // Фальклярыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. арт. / пад нав. рэд. Т.А. Марозавай, В.В. Прыемка. – Мінск, 2006. – Вып. 3. – С. 213 – 219.

РЭЗЮМЭ

Алфёрава Алена Генадзьеўна

Вобразна-паэтычная сістэма ўсходнеславянскіх і заходнеславянскіх загадак аб прыродных з'явах і раслінным свеце (параўнальны аспект)

Ключавыя словы: вобразна-паэтычная сістэма, славянскія загадкі, адгадка, метафара, этнакультурная традыцыя, зоамарфізацыя; фітамарфізацыя, антрапамарфізацыя, сацыякультурная рэалія, вобраз-дзеянне, вобраз-прыкмета.

Мэта дысертацыі – шляхам параўнання вобразна-паэтычных сістэм ўсходнеславянскіх і заходнеславянскіх загадак аб прыродных з'явах і раслінным свеце вызначыць узроўні падабенства і прычыны адрознення ў спосабах рэпрэзентацыі загаданых аб'ектаў.

Метады даследавання. Пры правядзенні дысертацыйнага даследавання выкарыстоўваўся параўнальна-тыпалагічны аналіз у сукупнасці з гісторыка-генетычным.

Атрыманыя вынікі і іх навуковая навізна. У дысертацыі ўпершыню ў беларускай фальклярыстыцы супастаўлены вобразна-паэтычныя сістэмы ўсходнеславянскіх і заходнеславянскіх загадак аб прыродных з'явах і раслінным свеце, вылучаны асноўныя тыпы метафарычных замяшчальнікаў, акрэслена кола аб'ектаў загадвання, прааналізаваны тыпалагічная і нацыянальна адметная групы метафарычных рэферэнтаў агульных аб'ектаў загадвання, вызначаны прынцыпы метафарычнай рэпрэзентацыі этнічна абумоўленых замяшчальнікаў, паказаны шляхі руху ад метафары міфалагічнай да метафары паэтычнай.

Галіна выкарыстання. Матэрыялы дысертацыі прыдатныя для далейшага даследавання вобразна-паэтычных сістэм славянскіх загадак, яны могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы лекцый і семінараў у вышэйшых і спецыяльных навучальных установах, у школьнай практыцы, а таксама пры стварэнні вучэбных дапаможнікаў па фальклоры.

РЕЗЮМЕ

Алфёрова Елена Геннадьевна

Образно-поэтическая система восточнославянских и западнославянских загадок о природных явлениях и растительном мире (сравнительный аспект)

Ключевые слова: образно-поэтическая система, славянские загадки, отгадка, метафора, этнокультурная традиция, зооморфизация; фитоморфизация, антропоморфизация, социокультурная реалия, образ-действие, образ-примета.

Цель диссертации – путём сравнения образно-поэтических систем восточнославянских и западнославянских загадок о природных явлениях и растительном мире определить уровни схожести и причины отличия в способах репрезентации загадываемых объектов.

Методы исследования. При проведении диссертационного исследования использовался сравнительно-типологический анализ в совокупности с историко-генетическим.

Полученные результаты и их научная новизна. В диссертации впервые в белорусской фольклористике сопоставляются образно-поэтические системы восточнославянских и западнославянских загадок о природных явлениях и растительном мире, выделены основные типы метафорических заместителей, очерчен круг объектов загадывания, проанализированы типологическая и национально отличительная группы метафорических референтов общих объектов загадывания, определены принципы метафорической репрезентации этнически обусловленных заместителей, показаны пути движения от метафоры мифологической к метафоре поэтической.

Область применения. Материалы диссертации применимы для дальнейшего исследования образно-поэтических систем славянских загадок, они могут быть использованы при подготовке лекций и семинаров в высших и специальных учебных заведениях, в школьной практике, а также при создании учебных пособий по фольклору.

SUMMARY

Alfiorava Alena H.

Figurative-poetic system of East Slavic and West Slavic riddles about the natural phenomena and vegetative world (comparative aspect)

Key words: a figurative-poetic system, Slavic riddles, an answer, a metaphor, ethnocultural tradition, zoomorphization, phitomorphization, anthromorphization, sociocultural object, figure-action, figure-sign.

The purpose of the dissertation is to determine the levels of similarity and the causes of difference in the means of representation of the proposing objects by comparison of the figurative and poetical systems of the East Slavic and West Slavic riddles about the natural phenomena and vegetative world.

The methods of research. While carrying out of dissertational research the rather-typological in the aggregate with historical and genetic analysis were used.

The received results and their scientific novelty. In the dissertation for the first time in Belorusian study of folklore the figurative and poetical systems of East and West Slavic riddles about the natural phenomena and vegetative world are compared, the main types of the metaphorical substitutes are choosen, the range of the thinking objects is listed, the typological and nation-distinctive groups of the metaphorical substitutes of the common thinking objects are analyzed, the principles of the metaphorical representation of the ethnic conditioned substitutes are determined, the ways from the mythological metaphor to poetical metaphor are described.

The field of application. The copy and results of the thesis can be used for futher investigation the figurative and poetical systems of the Slavic riddles, they can be used during the preparation for the lectures and lessons at schools and institutes of higher education, during the creation new school-books about folklore.